СВАБОДА

№15 19 — 25 красавіка 1994 г.

Кошт 100 рублёў

# Прэзыдэнцкая гонка стартавала

- **Некаторыя нават красьці перасталі — выбарамі занялiся**
- **Кампанію Лукашэнкі будзе фінансаваць „камсамольскі“ бізнэс**
- **Кебіч спадзяецца на чыноўнікаў і дзяржаўны бюджэт**

Увечары 19 красавіка з Цэнтральнай выбарчай камісіі нам паведамілі, што сямёра прэтэндэнтаў на пасаду Прэзыдэнта ўжо перадалі на рэгістрацыю сьпісы сваіх ініцыятыўных групаў.

У В.Кебіча — 3.920 чалавек, В.Новікава — 3.041,
у групе Пазьняка — 2.734 чалавек,
у А.Лукашэнкі — 2.427, у Г.Карпенкі —1677,
ва Ўл. Карагіна — 1487,
у С.Шушкевіча — 1.420 чалавек.

Збор подпісаў афіцыйна пачнецца 25 красавіка і завершыцца праз дваццаць дзён — 14 траўня. Хто не зьбярэ 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў — можа быць вольны. Толькі таварыш Кебіч мае падстрахоўку — ён дасьць каманду і лёгка атрымае 70 подпісаў дэпутатаў Вярхоўнага Савету.

Аднак Вячаслаў Францавіч разумее, што ісьці на выбары, маючы за душою ўсяго толькі аўтографы нардэпаў, надта непрыгожа, таму ён хоча заручыцца яшчэ і «ўсенародную падтрымкаю». Гэтую падтрымку абавязаныя арганізаваць мясцовыя ўлады і дырэктары прадпрыемстваў. Першую частку яны зрабілі — скалацілі таварышу Кебічу ініцыятыўную групу. Амаль увесь сьпіс — гэта чыноўнікі розных рангаў, ёсьць таксама настаўнікі і, зразумела, мэханізатары. З подпісамі выбаршчыкаў будзе цяжэй: Вячаслава Францавіча чамусьці ня дужа любяць за сьценамі начальніцкіх кабінэтаў. Але падпісвацца ўсё адно будуць, баючыся, што «не дадуць каня», «скароцяць з працы» і г.д.

Так што таварыш Кебіч нібыта на кані. Вось толькі краіны шкада. Яны й так давялі яе да ручкі, а цяпер зусім можа ляснуцца, бо ўвесь дзяржаўны апарат два месяцы будзе заняты выключна адной справай — прапіхваньнем свайго патрона ў прэзыдэнты. Кажуць, што некаторыя нават красьці перасталі і цалкам пераключыліся на выбарчую кампанію. Відаць, разумеюць, што няма выйсьця: ці пан, ці прапаў.

Між тым, сабраць 100 тысяч подпісаў за такі кароткі тэрмін ня простая справа. Нават Народнаму Фронту, які найбольш спрактыкаваны ў гэтым, давядзецца добра папрацаваць. Але ці ўдасца сабраць подпісы іншым прэтэндэнтам, напрыклад, таму ж Шушкевічу ці Карпенку? Малаверагодна, што зьбярэ подпісы прэзыдэнт Саюза прадпрымальнікаў Ул.Карагін, нягледзячы на тое, што ягоныя зборшчыкі подпісаў нібыта будуць «матар'яльна стымулявацца».

Дарэчы, пра грошы. Грошай прэтэндэнтам трэба многа. Адзін бэнзын для разьездаў пацягне мільёны. Напрыклад, лукашэнкаўцы (Ганчар, Булахаў і інш.) сустракаліся, як нам вядома, з прадпрымальнікамі і прасілі падтрымаць іх «некалькімі мільярдамі рублёў». Аднак асоба Лукашэнкі выклікала энтузыязм толькі ў пэўнай часткі прадпрымальнікаў, а менавіта — ў «камсамольцаў» (былых функцыянэраў ЛКСМБ, якія пасьпелі зарабіць добрыя грошы яшчэ ў камуністычныя часы і цяпер маюць багатыя фірмы). Камсамольцы паабяцалі падкінуць на кампанію Лукашэнкі «трохі грошай».

У каго не баліць галава пра грошы, дык гэта ў Кебіча. На яго будуць працаваць ня толькі дзяржаўныя службоўцы, але і дзяржаўны бюджэт.

**Пятро ПАНКРАТОВІЧ**



*Малюнак Лявона РАЗЛАДАВА*

## TV ПРАГРАМА

Шушкевіч падпісаў пагадненьне з БСДГ

*стар. 2*

Граф Прушынскі вярнуўся

*стар. 2*

Нямецкія экспэрты пра сытуацыю ў Беларусі

*стар. 4*

Як змагацца супраць шпіёнаў і тэрарыстаў

*стар. 6*

ГОД ЗАСНАВАНЬНЯ 1902
ВЫХОДЗІЦЬ З 1990

Галоўны рэдактар **Ігар ГЕРМЯНЧУК**

Заснавальнік **Павал ЖУК**

Выдавец **«Газэта СВАБОДА», Ltd.**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
**220088, Менск, вул.Іванаўская, 56**

## У Пазьняка — юбілей

Пачатак збору подпісаў за вылучэньне Зянона Пазьняка кандыдатам у Прэзыдэнты Беларусі супаў зь ягоным юбілеем.

24 красавіка лідару Беларускага Народнага Фронту спаўняецца 50 гадоў. Віншуем!

## У Кантрольнай палаце чакаецца «чыстка»

**У Кантрольнай палаце насьпявае канфлікт паміж старшынём палаты Васілём Саковічам і групаю супрацоўнікаў, якія лічацца вылучэнцамі дэмакратаў.**

У прыватнасьці, гаворка ідзе пра дэпутатаў ВС В.Даўгалёва, М.Крыжаноўскага, В.Малашку і дэпутата Менскага абласнога савету А.Ігнаценку, якія працуюць у Кантрольнай палаце амаль ад пачатку.

Як лічаць экспэрты СВАБОДЫ, апазыцыйных дэпутатаў запрасілі сюды на працу перадусім дзеля таго, каб выклікаць у грамадзтве давер да новага кантрольнага органу. Аднак яны разгарнулі актыўную кантрольную дзейнасьць, пачалі наступаць на хвост злодзеям з Саўміну, і кіраўнічая намэнклятура вырашыла спыніць «гульні ў дэмакратыю». Ёсьць зьвесткі, нібыта Старшыні Кантрольнай палаты зьверху «параілі» разьвітацца з апазыцыянэрамі, і В.Саковіч шукае цяпер падставы, як гэта зрабіць без скандалу.

У якасьці даведкі зазначым, што сёньня ў Кантрольнай палаце сабралася цэлае сузор'е былых вельмі адказных партыйных і камсамольскіх функцыянэраў — інструктары ЦК, сакратары гаркамаў, райкамаў... Тут знайшлі прытулак аж два першыя сакратары ЦК ЛКСМБ. Але вось «пралезла» пара дэмакратаў — і псуюць усю «маліну».

**Іван СІДАР**




# Рускі брат, ідзі дамоў!

Вы глыбока памыляецеся, калі думаеце, што на тэрыторыі Беларусі знаходзіцца ўсяго дзьве-тры расейскія базы. Гэтых аб'ектаў каля 50. На мапе пазначана іхнае разьмяшчэньне. Зьвесткі дакладныя.

Утрыманьне расейскіх войскаў абыходзіцца Беларусі, як ужо паведамляла газэта СВАБОДА, у 1,9 млрд. даляраў. Расея не плаціла і ня плоціць нам за гэта ні капейкі. І плаціць ня будзе — так вырашыў В.Кебіч, падпісаўшы 12 красавіка ў Маскве дамову аб аб'яднаньні грашовых сыстэмаў.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## Урачыстая вечарына

**24 красавіка ў Менску ў канцэртнай зале Белдзяржфілярмоніі адбудзецца ўрачысты сход і сьвяточны канцэрт, прысьвечаны 200-м угодкам Вызвольнага Паўстаньня 1794 г.**

## Пікет каля нямецкай амбасады

**Сёньня, 20 красавіка, раніцай у Менску каля амбасады ФРГ (вул. Захарава, 26) будзе выстаўлены пікет. Акцыю ладзіць арганізацыйны камітэт Беларускай партыі Свабоды (БПС).**

Лідар БПС сп. С.Высоцкі заявіў карэспандэнту СВАБОДЫ: «Мы лічым Нямеччыну найбольш натуральным геапалітычным саюзьнікам Беларусі і хочам сваёй акцыяй заклікаць урад ФРГ да больш актыўных дзеяньняў у Эўропе».

На думку сп. Высоцкага, «Нямеччына можа ачысьціцца ад зла, нанесенага беларусам нацызмам, шляхам падтрымкі незалежніцкіх памкненьняў народаў Беларусі й Харватыі, якія найбольш церпяць цяпер ад расейскага ды сэрбскага імпэрыялізму».

**М.Ґ.**

## Свабодны прафсаюз падтрымлівае трох кандыдатаў

**Рада Свабоднага прафсаюзу Беларусі на сваім паседжаньні ў суботу 16 красавіка прыняла рашэньне падтрымаць на першым этапе прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі трох кандыдатаў — Зянона Пазьняка, Станіслава Шушкевіча і Генадзя Карпенку.**

На паседжаньні Рады СПБ прысутнічалі двое з трох прэтэндэнтаў у кандыдаты — Станіслаў Шушкевіч і Генадзь Карпенка, а таксама сакратар Управы БНФ Віктар Івашкевіч (сам Зянон Пазьняк у гэты час знаходзіўся ў Горадні).

Усе ўдзельнікі сустрэчы сышліся на тым, што першымі крокамі прэзыдэнта, калі ім будзе абраны дэмакратычны кандыдат, павінны стаць як мага хутчэйшая зьмена ўраду і забесьпячэньне дэмакратычных выбараў у Вярхоўны Савет.

Гаворачы пра падпісанае В.Кебічам пагадненьне аб аб'яднаньні грашовых сыстэмаў, экс-сьпікер беларускага парляманту, у прыватнасьці, зазначыў, што падпісаньне гэтае — ня што іншае, як палітычная акцыя, скіраваная на зьнішчэньне незалежнасьці Беларусі і палітычнае аб'яднаньне з Расеяй. «Урад здае дзяржаву, і трэба гэта спыніць», — сказаў Станіслаў Шушкевіч.

**Я.К.**

## Міністэрства таксама рыхтуецца

**Міністэрства культуры й друку Беларусі распрацавала праект пастановы, якая рэглямантуе асьвятленьне перадвыбарчай прэзыдэнцкай кампаніі дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі.**

Згодна ёй кожны кандыдат на пасаду прэзыдэнта, зарэгістраваны Цэнтральнай выбарчай камісіяй, мае права выкласьці сваю праграму ва ўсіх гарадзкіх, абласных і раённых газэтах. Аб'ём гэтай публікацыі не павінен перавышаць палову паласы незалежна ад фармату газэты. Што ж да выступаў прэтэндэнтаў па тэлебачаньні, то кожны зь іх атрымае ў суме па 2,5 гадзіны. Тое ж і на радыё.

**СІМ**

## Саўмін абяцае «заахвоціць»

**Цяпер для мясцовых уладаў задача №1 — прэзыдэнцкая кампанія.**

6 красавіка старшыня Берастаўіцкага райвыканкаму таварыш Карпуць запрасіў да сябе на нараду работнікаў культуры (усяго каля 20 чалавек) і правёў палітінфармацыю.

Ён патлумачыў, што краіне не патрэбен такі прэзыдэнт, як Шушкевіч, які «развaліў Саюз», не патрэбен і Карпенка, які «заляцаецца да інтэлігенцыі і камэрцыйных структураў», а Пазьняк, зразумела, зусім не падыходзіць... Старшыня выкрыў таксама амэрыканскіх дыпляматаў, якія хочуць толькі аднаго — разьяднаць Беларусь з Расеяй. Прычым, гэта, маўляў, ну толькі ягоная думка, але і «мнение более осведомленных товарищей».

Скончылася тым, што тав. Карпуць запрапанаваў прысутным далучыцца да ініцыятыўнай групы «рэальнага кандыдата» тав. Кебіча. Ён паабяцаў, што найбольш актыўныя будуць «заахвочаныя» Саўмінам. Пасьля была пэрсанальная гутарка з кожным удзельнікам нарады. Во стараюцца!

**А.І.**



## Шушкевіч падпісаў пагадненьне з БСДГ

**Станіслаў Шушкевіч падпісаў зь Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамадой перадвыбарчае пагадненьне, якое ён «абавязваецца выконваць у выпадку ягонага абраньня Прэзыдэнтам Беларусі».**

У пагадненьні, якое складаецца з 11-ці пунктаў, зафіксаваны, у прыватнасьці, наступныя палажэньні:

— Гарантыя незалежнасьці Беларусі, ейнага нэўтралітэту і бязьядзернасьці; ліквідацыя на тэрыторыі краіны замежных вайсковых базаў.

— Заканадаўчае забесьпячэньне дзейнасьці ў Беларусі палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў, ідэйныя пастулаты і практычныя дзеяньні якіх вядуць да падрыву незалежнасьці краіны.

— Забесьпячэньне правоў і свабодаў чалавека для людзей усіх нацыянальнасьцяў у адпаведнасьці зь міжнароднымі правам.

— Структурная рэарганізацыя калгасаў і саўгасаў шляхам пэрсаніфікацыі ўласнасьці і стварэньне спрыяльных умоваў для перапрацоўкі і рэалізацыі прадукцыі непасрэднымі вытворцамі.

БСДГ, са свайго боку, абавязалася «ўсімі наяўнымі сродкамі садзейнічаць абраньню С.Шушкевіча Прэзыдэнтам».

**Пятро ПАНКРАТОВІЧ**

## Граф Прушынскі вярнуўся

**Грамадзянін Канады і Польшчы Аляксандар Прушынскі, які нядаўна быў высланы за парушэньне візавага рэжыму за межы Беларусі, зноў апынуўся ў нашай краіне.**

У суботу 16 красавіка сп.Прушынскага бачылі ў Горадні, дзе ён выступаў перад актывістамі Саюзу палякаў са сваёю «прэзыдэнцкаю праграмаю». А ў нядзелю граф прыехаў ужо ў Менск, адкуль яго гэтак негасьцінна тыдзень таму выправіла сталічная міліцыя. Супрацоўнік міліцыі, які меў непасрэднае дачыненьне да высылкі сп. Прушынскага, заявіў тады карэспандэнту аднаго з агенцтваў, што «это чудо больше не будет проникать в Республику по потайным ходам».

Якім чынам граф зноў патрапіў да нас — пакуль невядома. Дагэтуль, як сьцьвярджаюць, ён прыяжджаў у Беларусь аднаму яму ведамымі шляхамі без адлаведнай візы.

Напярэдадні выхаду нумару газэты карэспандэнт СВАБОДЫ патэлефанаваў у Міністэрства ўнутраных справаў начальніку АВІРу Сяргею Стэсіку ды пацікавіўся, наколькі законным шляхам граф Прушынскі гэтым разам перасек беларускую мяжу. Аднак для шэфа АВІРу гэта была навіна, якая, здаецца, зацікавіла яго ў службовым пляне, бо на тым канцы дроту адказалі: «Спасибо за информацию».

Даруйце, граф, мы не хацелі вас «закладаць».

**Іван СІДАР**




Малюнак Лявона РАЗЛАДАВА

## У Магілёў прыходзіць даўніна

**У абласным цэнтры выйшаў з друку першы нумар гісторыка-краязнаўчага часопіса «Магілёўская даўніна».**

Сёньня на Беларусі выдаюцца ўжо тры спэцыялізаваныя гістарычныя часопісы — «Спадчына», «Беларуская мінуўшчына» і «Беларускі гістарычны часопіс». Разам з тым унікальнасьць «Магілёўскай даўніны» ў тым, што гэта першае выданьне такога кшталту, якое нарадзілася ў правінцыі і геаграфічна абмежаванае гістарычным мінулым аднаго канкрэтнага рэгіёну — Магілёўшчыны. Зрэшты, гісторыя межаў ня мае. Таму неўзабаве кожны жыхар Беларусі можа набыць часопіс «Магілёўская даўніна» ў шапіках «Саюздруку».

**Сяржук ІВАНОЎСКІ**

## За стронгу не шкада і даляраў

**Напрыканцы красавіка на Гарадзеншчыну прыедуць францускія рыбалоўцы.**

Апроч Гарадзенскага раёну яны таксама наведаюць Навагрудзкі. Болей за ўсё іх цікавіць стронга, таму яны пагадзіліся плаціць па 200 даляраў за тыдзень побыту. Французаў у першай групе будзе чалавек дзесяць.

**С.А.**

## СНІД пашыраецца

**Паводле зьвестак Міністэрства аховы здароўя Беларусі і Цэнтру прафіляктыкі СНІДу, на 1 студзеня 1994 г. у нас зарэгістравана 10 чалавек, хворых на СНІД, сярод іх трое дзяцей, і 100 ВІЧ-інфэкцыяваных, у тым ліку 6 дзяцей.**

Сярод краінаў былога СССР колькасьць хворых на СНІД і ВІЧ-інфэкцыяваных большая толькі ў Расеі і на Украіне: адпаведна 127 і 1134, 22 і 355. Дзьве трэці заражаных вірусам у Беларусі — мужчыны. Кожны другі інфэкцыяваны захварэў пасьля ўступленьня ў інтымную сувязь за мяжою. Часьцей за ўсё выяўляюцца заражаныя пасьля абсьледаваньня, вярнуўшыся з-за мяжы. На пачатак году ў Беларусі памерлі 6 хворых на СНІД, зь іх тры — летась.

**СІМ**

## Небаракі-каровы

**У калгасе «Зьвязда» Ваўкавыскага раёну надоі ад кожнай каровы зьнізіліся амаль на 500 кг. Старшыня калгасу лічыць, што гэта адбылося з-за стрэсавага стану кароваў.**

Рэч у тым, што непадалёк знаходзіцца кар'ер, у якім часта гучаць выбухі. Карацей, абстаноўка — франтавая. Асабліва кепскія справы на Калядзіцкай фэрме — самай блізкай да кар'еру. Дзіва што, калі пад час выбухаў сыплецца трасе як пры землятрусе. У калгасе чакаюць прыезду раённай камісіі, якая павінна вынесьці свой вэрдыкт.

**Вацлаў МАЛЕВІЧ**



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

**Ліст у рэдакцыю**

*Мы, маладыя афіцэры Ўнутраных войскаў, лічым сваім абавязкам паведаміць праз вашую газэту грамадзкасьці, што нашае камандаваньне, якое з высокіх трыбунаў заяўляе, нібыта войскі ня ўдзельнічаюць у палітыцы, на самой справе імкнецца ўцягнуць нас у палітычныя гульні.*

*6 красавіка памочнік камандуючага Ўнутранымі войскамі сабраў да сябе на нараду старэйшых афіцэраў і тлумачыў, як трэба праводзіць агітацыю ў час прэзыдэнцкай кампаніі і за каго павінны галасаваць вайскоўцы ды іхныя сем'і — за таварыша Кебіча. Іншыя кандыдытуры нават не называліся.*

*Такім чынам, прапагандысцкая машына ў нас запрацавала. Цалкам магчыма, што агітацыя за іншых кандыдатаў будзе разглядацца амаль як здрада Радзіме.*

**Група маладых афіцэраў Унутраных войскаў Рэспублікі Беларусі**



## Як Апазыцыя сустракалася з вэтэранамі

**8 красавіка група дэпутатаў Апазыцыі БНФ, атрымаўшы пісьмовае запрашэньне інвалідаў вайны і мэдычнага пэрсаналу шпіталю ў Бараўлянах, адклала ўсе справы і выправілася на сустрэчу да вэтэранаў.**

Якое ж было зьдзіўленьне дэпутатаў, калі ў шпітальных калідорах яны пабачылі разгубленых мэдыкаў і абураных інвалідаў. Высьветлілася, што галоўны доктар П.Ашурка зьнік у невядомым кірунку разам з ключамі ад актавай залі. Старшыні Бараўлянскага сельсавету і ягонаму намесьніку, якія таксама прыйшлі на сустрэчу, засталося разьвесьці рукамі.

Тады дэпутаты пазносілі лаўкі і кушэткі ў хол на калідоры, пасадзілі найбольш слабых інвалідаў. І ўсё адно большасьць зь іх, нямоглыя, вымушаныя былі стаяць на цэмэнтовай падлозе ў калідоры пад скразьнякамі.

Сустрэча прайшла жыва, людзі шмат пыталіся, давалі прапановы. Скончылася спатканьне невялікім канцэртам, які падрыхтавалі для інвалідаў-вэтэранаў сябры БНФ.

Вярнуўшыся ў Вярхоўны Савет, Старшыня Апазыцыі БНФ накіраваў на імя галоўнага доктара П.Ашуркі тэлеграму: «8 красавіка 1994 г. Вамі парушаны Закон аб статусе народнага дэпутата Рэспублікі Беларусі. Па пісьмовым запрашэньні 43-х інвалідаў і супрацоўнікаў шпіталю перад імі павінны былі выступіць зь інфармацыяй дэпутаты — сябры Апазыцыі ў Вярхоўным Савеце З.Пазьняк, Ю.Беленькі, Л.Баршчэўскі, пра што Вам было паведамлена. Вы ня выканалі сваіх абавязкаў перад дэпутатамі і перашкодзілі іхнай працы, спрабавалі сарваць сустрэчу, не далі памяшканьне, пакінулі працоўнае месца, дрэнна паставіліся да хворых і да выкананьня сваіх прафэсійных абавязкаў. У сувязі з гэтым патрабую неадкладна даць мне пісьмовае тлумачэньне па сутнасьці і матывах Вашых паводзінаў. Народны дэпутат Беларусі З.Пазьняк».

Зянон Пазьняк не выключае, што давядзецца перадаць справу ў суд. Дарэчы, спробы парушэньня Закону аб статусе народнага дэпутата ў дачыненьні да сяброў Апазыцыі назіраюцца ўсё часьцей.

**А.Н.**

## Група таварышаў

**Пры ваенкамаце г. Маладэчна на базе тутэйшай філіі Саюзу афіцэраў утворана «группа содействия».**

Каму ці чаму яна будзе садзейнічаць — невядома. Можа, мэру горада Г.Карпенку ў ягоным змаганьні за прэзыдэнцтва?

**Ул.ЧАЦЬВЯРГОЎ**

## Беспрацоўныя савецкія афіцэры згадваюць нядобрым словам Гарбачова з Колем

Пасьля таго, як быў заселены збудаваны турэцкаю «Энкаю» на нямецкія грошы жылы гарадок для вайскоўцаў, насельніцтва Слоніма адразу павялічылася на 6 тысяч чалавек. Аднак Гарбачоў з Колем не ўлічылі, што прывезенае да нас зь Нямеччыны войска будзе скарочана і застанецца бяз працы. Сёньня ў гэтым гарадку 1340 беспрацоўных, і Слонім стаў першым у вобласьці па беспрацоўі, а ў крамах хранічна не хапае прадуктаў.

Гарадзкія ўлады забілі ў званы. Прыехаў са сталіцы старшыня Дзяржкампрацы сп. Бадзей ды іншыя чыноўнікі, у тым ліку зь Міністэрства абароны. Адбылася трохгадзінная нарада. Сталічнікі нечага наабяцалі і паехалі. Пакуль рэальна толькі тое, што неўзабаве распачнуцца 9-месячныя курсы мэнэджмэнту, на якія запісаліся 74 афіцэры. Між іншым, гэтыя курсы «прабілі» актывісты мясцовай філіі Беларускага Згуртаваньня Вайскоўцаў.

Апроч гэтага, на прадпрыемствах Слоніма распрацаваныя праекты стварэньня некалькіх соцень працоўных месцаў. Вытворчасьць лядоўняў (150 працаўнікоў) вымагае 1,5 млрд. рублёў. Зборка аўтамабіляў (маскоўскіх) або выраб запасных частак (150—200 мейсцаў) запатрабуе 30 млн. расейскіх рублёў. 200 мейсцаў гарантуе вытворчасьць туалетнай паперы, якую Беларусь дагэтуль імпартуе. Нарэшце, каля вайсковага гарадка ў Воўчых Норах можна прадукаваць на экспарт клёцкі. Мурманскае параходзтва ўжо замовіла 10 тыс. тонаў.

Выдатныя намеры! Але дзе ўзяць грошы?

Тым часам у мястэчку Рось Ваўкавыскага раёну на нямецкія грошы будуюць 12 дамоў для вайскоўцаў зь Нямеччыны. З 826-ці заплянаваных кватэраў палова ўжо гатовая. Але, як заўжды, у нас чагонебудзь ды ня ўлічаць. Толькі цяпер высьветлілася, што мясцовая камунальная гаспадарка не разьлічаная на гэткую колькасьць жытла. Падлічылі, што на пашырэньне Жылкамунгасу (набыцьцё камунальнай тэхнікі, будаўніцтва вытворчай базы і г.д.) патрэбна 12,5 млрд. рублёў. Тым часам Роскі камунгас атрымаў на сёлета ўсяго 156 млн. рублёў. Хоць ты зноў зьвяртайся да тых немцаў...

**Сяргей МАКСІМОВІЧ**

## Ня хочуць мячэці ў вёсцы

**У красавіку распачаліся чартарныя авіярэйсы з Горадні ў Арабскія Эміраты.**

Першым жа самалётам тутэйшыя мусульмане адаслалі праект мячэці, якая будзе пабудаваная ў Горадні (арабы дадуць грошы). Гарвыканкам ужо адвёў пляцоўку і дае дазвол на ейную пабудову ў мікрараёне Румлёва.

Летась першая спроба пабудаваць мячэць у вёсцы Ласосна паблізу Горадні скончылася няўдачай. У Ласосьне ў XVI стагодзьдзі жылі татары, існавала мячэць і тварыў па-арабску паэт Фатыговіч. Але калі пачалі разьмячаць зямлю пад падмуркі мячэці, прыбеглі зь сенажаці людзі з косамі ды віламі — і не дазволілі. Намаўляў іх нават біскуп Кашкевіч, але і яго не паслухалі, сказаўшы, што ня хочуць мець у сваёй вёсцы мячэць. Вось табе і маем беларускую талерантнасьць! Зрэшты, вёска каталіцкая, а таму лічыцца «польскаю». А па-другое, існуе яшчэ ў межах горада чыгуначная станцыя Ласосна. Некаторыя гісторыкі мяркуюць, што мячэць існавала менавіта там.

**С.А.**

## Лукашэнка: «Я — нішчый»

**Выступаючы 15 красавіка на сустрэчы ў Горадні, дэпутат Лукашэнка назваў падпісанае Кебічам у Маскве пагадненьне «антынароднай акцыяй», палітычным шоў і фарсам. Гэтым ён вельмі зьбянтэжыў мясцовых пэнсіянэраў, якія чакалі ад яго пачуць адваротнае. Тады Лукашэнка паспрабаваў злагодзіць першае няўдалае ўражаньне ад сябе, патлумачыўшы, што супраць таго, каб стаяць на каленях перад Масквой, паколькі «там не перед кем стоять».**

Аднак неўзабаве Лукашэнка двойчы атрымаў воплескі, сказаўшы, што мафія ў Рэспубліцы Беларусі ня пройдзе і што «возле кормушки, имя которой — власть, все хрюкают одинаково: и красные, и белые (?)». Ён вельмі хваліў КДБ, а міліцыю — менш, заявіўшы, між іншым, што «уважаемый господин Данько, которого вы направили из города-героя Гродно в город-герой Минск, стал оплотом мафиозности».

Расказаўшы пра дзесяць вайсковых «ИЛ-76», даведзеных «до поросячьего визга», Лукашэнка не прамінуў папракнуць прысутных таксама за кепскае выхаваньне міністра Казлоўскага — «кстати, воспитанника Гродненской области». Дарэчы, ён сьцьвердзіў, што прыехаў выступаць у Горадню толькі пасьля таго, як атрымаў (ад каго, цікава?) гарантыі ўласнай бясьпекі.

Потым пайшлі пытаньні. У Лукашэнкі пацікавіліся, ці праўда, што ён зьбівае ў саўгасе сваіх мэханізатараў? Ён адказаў: «Даўно там не работаю, не ежжу туда і нікаво там не ізьбіваю». На словы «господин Лукашенко» адказаў: «Нікагда ім не был, я — нішчый!»

Гарадзенская праграма заежджага дэпутата была вельмі шчыльная: адбыліся сустрэчы з вайскоўцамі, рабочымі, дактарамі, настаўнікамі, пэнсіянэрамі, нават асобна — з палякамі. Кіраўніцтву Саюзу палякаў ён паабяцаў, што ўсе 330 тысяч палякаў вобласьці будуць хадзіць у польскія школы, калі яго выберуць прэзыдэнтам. Ад дактароў ён даведаўся, што апэрацыю апэндыцыту цяпер робяць нібыта без наркозу, замест якога хвораму даюць бясплатна тры чаркі гарэлкі або нават сьпірытусу. Гэтая навіна вельмі ўразіла прысутных мужчын, якіх на сустрэчы з Лукашэнкам было ня менш за палову.

**А.ЖАЎНЕРКА**

## Падпалілі дом судзьдзі

**У Клічаве зламысьнікі падпалілі недабудаваны дом старшыні суда Тацяны Цітковай.**

Згарэла драўляная вэранда. Міліцыя шукае падпальвачаў, але пакуль безвынікова. У тэлефоннай размове з карэспандэнтам СВАБОДЫ судзьдзя Цiткова сказала, што яна нікога не падазрае.

**М.Г.**

## Камунізм вяртаецца ў школу

**Кіраўніцтва Пінскага ГарАНА накіравала ў школы горада «Рекомендации по активизации пионерского движения».**

Дакумант унікальны. Напачатку ў ім канстатуецца, што ў школах горада «не вядзецца мэтанакіраваная праца па пашырэньні піянэрскай базы», што сёньня ў піянэрах ходзіць толькі 4% «ад агульнай колькасьці вучняў піянэрскага ўзросту»... Катастрофа!

Каб выправіць становішча, аддзел адукацыі гарвыканкаму «лічыць неабходным: 1. Правесьці агітацыйную і прапагандысцкую працу сярод дзяцей дзеля разгортваньня піянэрскага руху ў школах; 2. Прыём у піянэры лічыць прыярытэтным у арганізацыі выхаваўчай працы; 3. Прыкласьці максымум намаганьняў дзеля дастойнай сустрэчы і правядзеньня 19 траўня дня нараджэньня піянэрыі».

«Рэкамэндацыі» падпісала выканаўца абавязкаў загадчыцы аддзелу адукацыі Л.Кахнюк і... сакратар гаркаму ЛКСМБ М.Лабко. Усё як у добрыя брэжнеўскія часы. У пінскіх школах пачалі ліхаманкава выконваць «Рэкамэндацыі» — каб «дастойна сустрэць дзень піянэрыі».

**Алена СТАСЕВІЧ**

**Кобрынь**

## Баяцца, што зноў раскулачаць

**У Кобрыні, дзе жыве больш за 50 тысячаў чалавек, з пачатку году паступіла ўсяго 11 заяваў на выкуп прысядзібных дзялянак.**

Пастанова прынятая толькі па 3 заявах. Між тым, у Кобрыні з прысядзібных дзялянак «корміцца» даволі шмат людзей. За галоўны аргумант нежаданьня займець сваю дзялянку ў «вечнае карыстаньне» гаспадары выстаўляюць яшчэ дзедаўскае: «Вось вернецца бальшавік і адбярэ ўсё назад». Зрэшты, той бальшавік нікуды й не сыходзіў.

## Тараса не шануюць

**Як паведамляе тутэйшы друк, нядоўга правісела мэмарыяльная шыльда на доме ў вёсцы Кустовічы, дзе, як мяркуюць, у юнацтве крыху бавіў час Тарас Шаўчэнка.**

Прымацавалі яе госьці з Украіны разам з прадстаўнікамі грамадзкасьці Кобрыншчыны, калі сьвяткавалася 180-годзьдзе з дня нараджэньня вялікага Кабзара. Літаральна праз суткі шыльду з дома нехта сарваў. Невядома, каму гэтак замінала згадка пра песьняра Украіны.

**Мірон ГАМОН**





© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Як прадаваць незалежнасьць

## Урыўкі з будучай хрэстаматыі

**ДАМОВА аб аб'яднаньні грашовай сыстэмы Рэспублікі Беларусі з грашовай сыстэмай Расейскай Фэдэрацыі і ўмовах функцыянаваньня агульнай грашовай сыстэмы**

(...)

***Артыкул 5***

З дня ўступленьня гэтай Дамовы ў сілу Цэнтральны банк Расейскай Фэдэрацыі набывае правы й паўнамоцтвы адзінага эмісійнага банку і органу грашова-крэдытнага і валютнага рэгуляваньня ў аб'яднанай грашовай сыстэме.

Грашова-крэдытная эмісія на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі ажыцьцяўляецца Цэнтральным банкам Расейскай Фэдэрацыі праз Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусі.

У працэсе абмену грошай адпаведна ўмовам артыкулаў 2, 3 і 4 гэтай Дамовы баланс Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі ўключаецца ў баланс Цэнтральнага банку Расейскай Фэдэрацыі. Гэтым ствараецца аснова адзінай грашовай сыстэмы дзьвюх краін.

Цэнтральны банк Расейскай Фэдэрацыі адказвае па абавязках Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі.

Бакі ствараюць неабходныя ўмовы для выкананьня Цэнтральным банкам Расейскай Фэдэрацыі адпаведнай дзейнасьці на іхных тэрыторыях у інтарэсах абедзьвюх дзяржаваў.

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусі ўдзельнічае праз сваіх прадстаўнікоў у Цэнтральным банку Расейскай Фэдэрацыі ў распрацоўцы і рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі, рэгулюе ў рамках гэтай палітыкі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі крэдытныя дачыненьні, грашовае абарачэньне, парадак разьлікаў, выдае ліцэнзіі на права займацца банкаўскай дзейнасьцю, нясе адказнасьць за арганізацыю і ажыцьцяўленьне нагляду за працай банкаў.

***Артыкул 8***

(...)

Рэспубліка Беларусь уводзіць мытныя тарыфы, падаткі і зборы ў дачыненьні ўвозу і вывазу тавараў, цалкам ідэнтычныя мытным тарыфам, падаткам і зборам, дзейным у Расейскай Фэдэрацыі на момант падпісаньня гэтай Дамовы. Пасьля ўвядзеньня цалкам ідэнтычных мытных пошлінаў, падаткаў і збораў іхная зьмена выконваецца Ўрадам Расейскай Фэдэрацыі з улікам інтарэсаў Рэспублікі Беларусі і пасьля кансультацыяў зь яе паўнамоцнымі прадстаўнікамі;

пералік ліцэнзаваных і кватаваных тавараў, памеры экспартных квотаў на тавары, кватаваныя Расейскай Фэдэрацыяй, пры іх вывазе ў трэція краіны вызначаюцца для абедзьвюх дзяржаваў адпаведнымі органамі Расейскай Фэдэрацыі з улікам інтарэсаў Рэспублікі Беларусі і пасьля кансультацыяў зь ейнымі паўнамоцнымі прадстаўнікамі.

(...)

***Артыкул 9***

З моманту поўнай адмены мытных пошлінаў ва ўзаемным гандлі Рэспубліка Беларусь ня будзе спаганяць пошліны, падаткі і зборы, якія маюць фіскальны характар, за транзыт тавараў, пастаўленых з Расейскай Фэдэрацыі ў трэція краіны і Калінінградзкую вобласьць і з трэціх краін і Калінінградзкай вобласьці ў Расейскую Фэдэрацыю.

З вайсковых фармаваньняў Расейскай Фэдэрацыі са складу Стратэгічных сілаў, часова разьмешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі, ня будзе таксама спаганяцца арэндавая плата за зямлю і за нерухомую маёмасьць, што знаходзіцца ў іхным карыстаньні, і ўсе віды падаткаў, акрамя падаткаў, зьвязаных з гаспадарчай дзейнасьцю.

*За Ўрад Расейскай Фэдэрацыі — В.Чарнамырдзін*

*За Ўрад Рэспублікі Беларусі — В.Кебіч*

*За Цэнтральны банк Расейскай Фэдэрацыі — В.Герашчанка*

*За Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусі — зь пярэчаньнямі па артыкуле 5 — С.Багданкевіч*

(Падпісана ў Маскве 12 красавіка 1994 г.)

# Шушкевіч пужае Расею беларускімі нацыянал-радыкаламі

**С.Шушкевіч назваў падпісаную В.Кебічам дамову аб аб'яднаньні грашовых сыстэмаў «прыкладам рабскіх паводзінаў».**

«Гэтая дамова, — сказаў Шушкевіч, — нявыгадная ні Беларусі, ні самой Расеі, бо ейны немінучы правал выкліча ў беларускага насельніцтва рост антырасейскіх настрояў і ўмацаваньне пазыцыяў нацыянал-радыкалаў. Апроч таго, гэтая дамова ў многіх пазыцыях супярэчыць ужо ратыфікаванай Вярхоўным Саветам заяве аб аб'яднаньні грашовых сыстэмаў. Урад чарговы раз прадэманстраваў поўны непрафэсіяналізм. Я наагул ацэньваю гэтую дамову як палітычны трук напярэдадні выбараў. Не падпісаны Багданкевічам 5-ы артыкул, які супярэчыць Канстытуцыі, відаць, пазьней будзе зьменены, як ужо намякаў прэм'ер, больш слабым варыянтам аб уключэньні балансу Нацыянальнага банку Беларусі ў кансалідаваны баланс банку Расеі. І, вядома ж, гэта будзе пададзена як новая дыпляматычная перамога нашага ўраду. На самой справе нават пры такім варыянце — гэта поўная параза і поўная здача інтарэсаў Беларусі. Дастаткова параўнаць тэксты ратыфікаванага пагадненьня і новай дамовы».

**М.Г.**

# І Лукашэнка супраць...

**Падобна на тое, што галоўны барацьбіт з карупцыяй Аляксандар Лукашэнка канчаткова адбіўся ад Кебічавых рук.**

13 красавіка на прэс-канфэрэнцыі для рэдактараў заводзкіх шматтыражак ён выступіў супраць «выбару ўсяго жыцьця» Вячаслава Кебіча — падпісанага ў Маскве пагадненьня аб аб'яднаньні грашовых сыстэмаў Расеі і Беларусі. «Подписанное в Москве соглашение — это далеко не то, что нам хотелось бы», — заявіў Аляксандар Лукашэнка. На ягоную думку, падпісаньне гэтага пагадненьня трохі ўзьнімае шанцы Кебіча на прэзыдэнцкіх выбарах, аднак «еще очень и очень много времени до выборов, чтобы людям протрезветь и разобраться, что есть что, и пощупать этот процесс с точки зрения улучшения жизни людей». А.Лукашэнка глыбока ўпэўнены, што «с Кебичем и его командой никто в Москве разговаривать не хочет», і толькі чакаюць не дачакаюцца, каб да іх завітаў Аляксандар Рыгоравіч — нават запрашэньне прыслалі. Тое запрашэньне ён прыняў і зьбіраецца бліжэйшым часам наведаць «столицу-матушку», каб сустрэцца з дэпутатамі Дзяржаўнай Думы.

**Ян КАМОЦКІ**

# «Ёсьць сэнс дапамагаць тым сілам, якія бачаць сваю краіну эўрапейскаю дзяржаваю»

## Такую выснову зрабілі нямецкія экспэрты, якія вывучалі ў Беларусі ўнутрыпалітычную сытуацыю

**Газэта СВАБОДА неафіцыйным чынам атрымала падрыхтаваны немцамі даклад (10 старонак тэксту), вытрымкі зь якога прапануем нашым чытачам.**

### Падманлівая стабільнасьць

Вывучэньне дакумантаў, а таксама асабістыя гутаркі аўтараў гэтага матар'ялу з прадстаўнікамі ўраду, парляманту, эканомікі й навуковай сфэры ў студзені 1994 г. у Менску выявілі наступнае: Рэспубліка Беларусь ні ў якім разе ня ёсьць востравам збалянсаваных інтарэсаў, цярпімасьці, эканамічнай і палітычнай стабільнасьці, як гэта ахвотна дэкляруюць ейныя ўладатрымальнікі. Праўда, канфліктаў і разладу ў такой ступені, якія насьпяваюць на Ўкраіне, тут не назіраецца. У пацьверджаньне гэтай высновы гаворыць і тое, што большасьць насельніцтва, здаецца, станоўча ставіцца да шчыльнага збліжэньня з Расеяй. Тым ня менш супярэчнасьці ў Беларусі, відаць, яшчэ абвострацца, бо «партыя ўлады» — перабудаваны другі эшалён старой партыйна-дзяржаўнай намэнклятуры — разваліла і без таго палавіністы кампраміс з цэнтрыстамі і апазыцыяй, сьведама палярызаваўшы суадносіны палітычных сілаў. Адстаўка Шушкевіча пераканаўча прадэманстравала гэта.

### Эканамічны спад

Эканамічны развал набыў у Беларусі драматычныя формы. Прадстаўнікі апазыцыі, а таксама тэхнакраты з каманды Шушкевіча паказваюць на тое, што хаця парлямант і прыняў шэраг законаў аб рэформе, але іхнае ажыцьцяўленьне блякуецца ўрадам альбо папросту правальваецца з-за некампэтэнтнасьці. Каб узяць пад кантроль усе важныя сфэры эканамічнай дзейнасьці, урад яшчэ больш разьдзімае свой апарат, што шкодзіць правядзеньню неабходных структурных перабудоваў і абнаўленьню. Прыкладам можа быць праграма ТАЦІС, распрацаваная ЭС: непасрэдныя сувязі паміж групамі кансультантаў і мясцовымі прадпрыемствамі ды ўстановамі почасту зрываюцца з-за супраціву ўрадавых ведамстваў.

На погляд апазыцыі, урад упусьціў магчымасьць своечасова правесьці перамовы з Масквою пра кошт выкарыстаньня беларускіх транспартна-энэргетычных камунікацыяў (нафта- і газаправодаў). Сродкі ад аплаты расейскага транзыту на Захад маглі б, няхай часткова, кампэнсаваць падвышэньне расейскіх цэнаў на сыравіну і энэрганосьбіты. Яшчэ адзін найістотнейшы аспэкт: два гады таму цалкам рэальныя былі шанцы для глыбокіх структурных рэформаў без катастрафічнай ломкі — аднак гэтых шанцаў не скарысталі. Апазыцыя тлумачыць бязьдзейнасьць ураду, акрамя распаўсюджаных матываў (умацаваньне ўлады й прывілеяў, некампэтэнтнасьць), сьведамай стратэгіяй кіраўніцтва на шчыльную рэінтэграцыю краіны з Расеяй. На прыкладзе эканамічнага развалу насельніцтву нібыта павінна быць прадэманстравана: самастойнасьць Беларусі — гэта прывідная ідэя, без аб'яднаньня з Расейскай Фэдэрацыяй краіна ня зможа існаваць. Адсюль вынікае і тое значэньне, якое надае апазыцыя датэрміновым перавыбарам — толькі радыкальны палітычны пераварот, на думку апазыцыі, дае пэрспэктывы для паступовага выйсьця з-пад Расеі, для ўмацаваньня нацыянальнай незалежнасьці.

Прадстаўнікі «партыі ўлады» далёкія ад таго, каб адмаўляць сваю мэту як мага шчыльнейшага прывязваньня краіны да Расеі — наадварот, яны спасылаюцца на тое, што Беларусь зусім ня ў стане эканамічна забясьпечыць незалежнасьць.

### Прарыў «партыі ўлады»

Пасьля спробы перавароту ў Маскве ў жніўні 1991 г., які кіраўнічыя колы ў Менску напачатку віталі, намэнклятуры давялося перш прыстасоўвацца да новых умоваў і пайсьці на пэўныя саступкі апазыцыі (прыняцьце законаў аб эканамічнай рэформе, стварэньне нацыянальнага войска, абвешчаньне нэўтралітэту краіны ды інш.). Але папраўдзе яна ні на хвіліну не выпускала з рук бастыёны ўлады. Тут варта назваць такія стаўпы «партыі ўлады»:

а) Урад Кебіча, які функцыянуе з красавіка 1990 г. і моцна трымае эканоміку краіны, яшчэ на 92% дзяржаўную. Пасьля жніўня 1991 г. гэты ўрад моцна папоўніўся намэнклятураю ЦК. Як уладальніца распарадчых паўнамоцтваў, «партыя ўлады» кіруе вэртыкальнымі каналамі да самага нізу — да самай апошняй вёскі.

б) Войска і вайскова-прамысловы комплекс, якія ўзмоцнена працуюць на рэінтэграцыю з Расеяй (і падтрымліваюць асаблівыя ўзаемадачыненьні з партнэрамі ў Маскве). Дагэтуль афіцэрскі корпус складаецца амаль на 70% з этнічных расейцаў, якіх у агульнай лічбе насельніцтва толькі 13%.

в) Фракцыя «Беларусь», якая налічвае 120 чалавек — наймацнейшая група ў Вярхоўным Савеце. Яна разам з фракцыяй камуністаў (40 чалавек) стварае цьвёрдае ядро эліты ўлады, пры гэтым яна можа прыцягнуць на свой бок большасьць фармальна беспартыйных парлямантараў.

г) Тэлевізія, радыё й друк. Яны амаль цалкам залежаць ад ураду — альбо непасрэдна падначаленыя, альбо праз датацыі на друк і распаўсюд.

«Партыя ўлады» сьвядома пайшла на тое, каб прадэманстраваць у сябе ў краіне і за яе межамі: мы зноў усе вярнуліся, у нас улада, цяпер мы бескампрамісна працягнем сваю праграму. У свой зьмест яна ўлучае — акрамя ўжо згаданага імкненьня да эканамічнай і валютна-палітычнай рэінтэграцыі з Масквой — перадусім два аспэкты: умацаваньне бясьпекі ўлады ў сябе ўнутры, а таксама вайскова-палітычнае збліжэньне з Расеяй (альбо з СНД пры дамінацыйнай ролі Расеі ў ёй). Што да праверкі сілаў у межах сваёй краіны, дык кіраўнічай эліце ўдалося адкласьці перавыбары парляманту, якіх патрабавала апазыцыя (і якія сталіся неабходнымі ў выніку пасьяховага збору подпісаў увесну 1992 г. за рэфэрэндум па гэтым пытаньні), і ўрэшце сарваць іх. Кіраўнічая эліта баялася, што апазыцыя калі і ня выйдзе на новых выбарах як найбуйнейшая сіла, дык значна павялічыцца ў параўнаньні зь сёньняшнімі 10% ад складу ВС.

### Спадзевы на Захад

З-за такіх суадносінаў сілаў у Беларусі і тэндэнцыяў павароту да Расеі магчымасьці Захаду пасьпяхова спрыяць нутраным рэформам і разьвіваць дачыненьні зь Беларусяй цяпер даволі невялікія. У гэтым кірунку мала што можа зьмяніць і дамова аб партнэрстве й супрацоўніцтве, наконт якой ідуць перамовы ЭС зь Беларусяй. Аднак для Захаду мае сэнс, акрамя падтрымкі ў пералічаных раней сфэрах, мэтанакіравана разгортваць пэўныя віды дзейнасьці і спрыяць тым сілам, якія бачаць сваю краіну пры ўсёй шчыльнай пераплеценасьці з Расеяй перш за ўсё як эўрапейскую (а не эўраазіяцкую) дзяржаву. Такія сілы ёсьць і сярод «партыі ўлады». Так, праграму ТАЦІС належыць вызваліць з-пад паралізавальнага кантролю ўладаў у Менску і прадуктыўна зьвязаць з асобнымі пілёт-праектамі, у плённасьці якіх пасьля пераканаюцца людзі. Асабліва важнымі былі б, апроч гэтага, праграмы і прызначэньне стыпэндыяў для падрыхтоўкі й перападрыхтоўкі спэцыялістаў, перадача ведаў і кампэтэнтнасьці ў эканоміцы, фінансавай справе, палітыцы й журналістыцы. Бо і па сёньня адчуваецца моцны дэфіцыт прафэсійнасьці ў гэтых галінах.

Нарэшце, трэба назваць яшчэ адно пажаданьне, якое асабліва падкрэсьлівае беларуская апазыцыя. Гэта просьба: разглядайце нашую краіну як эўрапейскую дзяржаву, прыбярыце «інфармацыйную блякаду» Беларусі. Распавядайце пра ейную гісторыю, культуру і сучасныя праблемы. Не дазваляйце адсунуць нас убок, нібыта нейкі натуральны прыдатак і малодшага брата Расеі.

**Магдаленэ ГОФ, Гайнц ТЫМЭРМАН**



© PDF: Kamunikat.org 2010

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Сяргей ДУБАВЕЦ

# Вячаслаў Кебіч — ад БНФ

Пройдзе яшчэ гадоў пяцьдзясят, і ў незалежнай Беларусі зьявіцца падручнік сучаснай палітычнай гісторыі. У ім ужо ня будзе сёньняшніх страсьцей, намёкаў ды прапагандысцкіх выгадаў-нявыгадаў. Будзе толькі аналіз сёньняшняй палітычнай сытуацыі й дзейных асобаў, іх эвалюцыі ды магчымых нерэалізаваных шляхоў разьвіцьця. Думаю, для нашага сучасьніка спакусьліва было б прачытаць разьдзел падручніка, які называецца «Пэрыяд прэзыдэнцтва В.Кебіча». Многае яго, сучасьніка, там бы зьдзівіла. Але ня менш зьдзівіў бы і папярэдні разьдзел — пра перадпрэзыдэнцкую сытуацыю на Беларусі. Напрыклад, пра тое, што Вячаслаў Кебіч — гэта стаўленік Беларускага Народнага Фронту...

...1990 год. Вясна. Беларускі Народны Фронт рыхтуецца да выбараў Вярхоўнага Савету. На паседжаньнях Сойму, управы й сакратарыяту, у кулюарах абмяркоўваюцца магчымыя кандыдатуры кіраўнікоў краіны. Выбар небагаты. Асабліва што да прэм'ера, дык наагул няма ніякага выбару. Тымчасам у ЦК пазначыўся раскол на кансэрватараў і рэфармістаў. Першых прадстаўляюць Сакалоў з Малафеевым, другіх — старшыня дзяржпляну Кебіч. БНФ робіць стаўку на «лепшыя сілы ў КПСС» і праз іх знаходзіць кантакт ды паразуменьне з Кебічам. Такім чынам Кебіч атрымлівае карт-бляншь дэмакратычных сілаў і шырока гаворыць пра рэформы.

Проціборства ў ЦК разьвіваецца зь пераменным посьпехам. Лідарам КПБ становіцца Малафееў, затое на пасаду прэм'ер-міністра пленум ЦК рэкамэндуе Кебіча. Кебіч праводзіць перамовы з БНФ, настае дзень выбараў прэм'ера, уся фракцыя БНФ галасуе за Вячаслава Францавіча.

Зразумела, што выбіралі з горшага, што былі вымушаныя, што жахліва не хацелася, — але ўсе гэтыя матывы маюць вагу сёньня. У падручніку палітычнай гісторыі іх ня будзе. Там будзе сытуацыя: рэтраград-кансэрватар Малафееў і дэмакрат-рэфарматар Кебіч. Першы прадстаўляе цёмныя сілы ў партыі і народзе, другі — сьветлыя, у тым ліку і БНФ. Зразумела, што ў сытуацыі аб'ектавай дзяржавы і вымушанай незалежнасьці Кебіч мусіў эвалюцыянаваць «ад праціўнага» — ад Малафеева. І дабрэйшы чалавек Мікалай Іванавіч Дземянцей дарогу б ні яму, ні сувэрэнітэту не перабег. Перабег Шушкевіч. Дэмакрат, не з ЦК, падтрыманы БНФ на выбарах. Пазыцыйна выйшла так, што Шушкевіч сыпіхнуў Кебіча на месца Малафеева. Утварылася процістаяньне іншага кшталту. Магчыма, гэта адбылося пасьля Белавескай пушчы, дзе Шушкевіч і Кебіч хавалі Саюз яшчэ разам.

Цяпер БНФ страціў сувязь з Кебічам, а грамадзкая сьведамасьць ужо зьвязала яго, Фронт, з Шушкевічам. Фронт ужо казаў пра цёмныя сілы на чале з Кебічам, а грамадзкая сьведамасьць дамалёўвала на сьветлым баку Шушкевіча. Фронт, выбіраючы, як заўсёды, з горшага, хоць жахліва не хацелася, вымушаны быў час ад часу з гэтым згаджацца. Нарэшце, Кебіч «заваліў» Шушкевіча.

Дзякуючы сваёй уладзе, у тым ліку над сродкамі масавай інфармацыі, Кебіч становіцца першым прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі. Але абапіраецца цяпер ён, стаўленік «лепшых сілаў КПСС» і БНФ — ужо на горшыя сілы. Ранг прэзыдэнта так ці інакш змусіць яго зьвярнуцца калі не да БНФ, дык прынамсі да ягоных пастулятаў пра дэмакратыю, незалежнасьць, дзяржаўнасьць і — новых людзей (бо з данілавымі можна гуляць толькі ў дзяржаўны рэкет, а не ў прэзыдэнцкую палітыку). Другі варыянт — гэта зусім далучыцца да Расеі і стаць гэнэрал-губэрнатарам. Але гэта маларэальна. Лепш сядзець на адной лаўцы зь Ельцынам і Бушам, чым «лавіць» іхныя загады па тэлевізары і рапартаваць пра пастаўкі...

Так у агульных словах выглядае гэты разьдзел з падручніка палітычнай гісторыі Беларусі. Наступны разьдзел будзе напісаны праз пяцьдзясят гадоў.

# На каго працуе МЗС?

Я, даўні чытач і прыхільнік Вашае газэты, асабліва ўважліва сачу за ўсімі публікацыямі на зьнешнепалітычныя тэмы. Усе яны сьведчаць толькі пра адно: Беларусь ня праводзіць сваёй, незалежнай, вонкавай палітыкі, як, зрэшты, і фінансавай, і вайсковай, і кожнай іншай. Увесь час з моманту атрыманьня незалежнасьці мы безнадзейна плянцемся ў хвасьце расейскай вонкавай палітыкі.

Складваецца ўражаньне, што беларускі МЗС практычна ні ў водным зьнешнепалітычным пытаньні ня мае ўласнага меркаваньня і са скуры вылузваецца, абы толькі дагадзіць Козыраву. Вось і апошні ўсплёск напружанасьці паміж Расеяй і краінамі Балты прывёў да пагаршэньня дачыненьняў паміж Беларусяй, з аднаго боку, і Латвіяй ды Эстоніяй — з другога (пра гэта напісала СВАБОДА ў №14). Характэрна, што ініцыятарам новага дыпляматычнага канфлікту выступіў сп. Краўчанка.

Ахінуты таямніцаю візыт сэрбскага міністра замежных справаў у Беларусь таксама сьведчыць пра імкненьне ўлагодзіць Маскву, якая недвухсэнсоўна падтрымлівае агрэсію сэрбаў супраць суседніх народаў. У гэтым кантэксьце прыгадваецца і інфармацыя аб продажы беларускай зброі ў Югаславію. Ці не пра вайсковае супрацоўніцтва дамаўляўся Кебіч падчас сакрэтнай сустрэчы з сэрбскім міністрам?

Мне здаецца, што ўсе гэтыя авантуры беларускага кіраўніцтва, якія паслухмяна выконвае МЗС, не дададуць Беларусі прэстыжу на міжнароднай арэне. Нас будуць проста ўспрымаць як сатэліта Расеі, які нават не жадае вырвацца з імпэрскай арбіты.

Уладзімер МАЎЧУН

Берасьце

# Падпісвайцеся пад жабрацтвам

Чамусьці пра настаўнікаў успамінаюць толькі перад выбарамі. Вось і цяпер спрабуюць зрабіць з нас штатных агітатараў і зьбіральнікаў подпісаў у падтрымку Старшыні Саўміну В.Кебіча. Зноў успомнілі словы М.С.Хрушчова аб тым, што «настаўнікі — гэта аўтаматчыкі партыі».

Ведаю, што сярод настаўнікаў знойдуцца людзі, якія будуць займацца гэтаю справаю. Ім я хачу сказаць толькі адно: трэба слухаць, што кажуць кіраўнікі дзяржавы. А В.Кебіч сказаў з экрана тэлевізара: «Прыняцьце артыкула аб гарантаванай аплаце настаўнікаў у Законе аб народнай адукацыі было памылкай». Так што — зьбірайце подпісы і падпісвайцеся самі пад сваім цяперашнім і будучым жабрацтвам.

Памятаеце, з якім зьдзіўленьнем пісаў журналіст «Комсомольской правды»: «У Беларусі ў магазінах ляжыць сем гатункаў маргарыну». Прайшлі гады... У суседзяў пачалася лібэралізацыя цэнаў, а зь ёй і падвышэньне заработнай платы. Кебіч жа стрымліваў і тое, і другое. Нас падманвалі карткамі спажыўцоў ды талёнамі, якія ляжаць нявыкарыстанымі і да сёньня. Разумныя людзі хоць прадалі свае карткі цыганам ды каўказцам, а большасьць верыла ўраду. За мяжу Беларусі пацяклі статкі жывёлы, каб «здацца» там па больш высокіх цэнах. Цягнікі зь Беларусі ператвараліся ў «каўбасныя». Праўда, на імгненьне мы ўбачылі тыя тавары, якія ўвесь час датаваліся з нашай кішэні і пра існаваньне якіх мы не здагадваліся, але гэта было толькі імгненьне. Тыя людзі, якія тады апынуліся бліжэй да разьмеркавальнага «карыта», сёньня будуюць палацы. Дзякуй, таварыш Кебіч!

Юры КЛІНЦОЎ

Гомель

# Беларусы — унікальны народ

Цяпер у Беларусі назіраецца новая зьява, якой няма нідзе на тэрыторыі былога СССР (апрача расейскамоўных Данбасу і Крыму) — народ пачаў «стамляцца» ад незалежнасьці і мовы. Дык Крым і Данбас — толькі частка Ўкраіны, а ў Беларусі падобнае ідзе ад Воршы да Берасьця.

Па маіх назіраньнях, Пазьняку ў нас спачуваюць 10% беларусаў, а Жырыноўскаму — 40%! У гэтым беларускі народ і нашыя ўлады ўнікальныя, бо гэты адзіны народ і адзіныя ўлады з усіх нерасейскіх рэспублік былога СССР, якія не напалохаліся Жырыноўскага. Ну, можа, апрача БНФ, дэмакратаў, а іх — 1% насельніцтва! Жырыноўскі напалохаў 100% эстонцаў, 90% казахаў, 40—50% украінцаў і... 1% беларусаў?

Так што вайсковы саюз з Масквою, «рублёвая зона», утрыманьне расейскіх войскаў за свой кошт — заканамерна. Тут ня Кебіч вінаваты, а стан беларускай нацыі. Такое грамадзтва будзе паводле законаў «прыроды й фізыкі» спаўзаць у склад Расеі альбо ў стан яе калёніі.

Калі б Валэнса запрасіў расейскія войскі застацца ў Польшчы назаўсёды на польскім утрыманьні, ці такое б зрабіў Бразаўскас у Летуве, то іх, мінуючы турму, адправілі б у псыхіятрычны шпіталь. Такі дзікі, на эўрапейскія меркі, абсурд — у Беларусі нармальная зьява. І ў мазгох 90% грамадзянаў, і ва ўрадзе. Такога маразму ня робіць нават Украіна, дзе 50% этнічных украінцаў размаўляе па-расейску.

С.ЗІНАЎ

Баранавічы



# 1968 г. Праская вясна. Мазураў

Узносячы алілую Кірылу Мазураву, савецкаму партыйнаму й дзяржаўнаму дзеячу, камуна забылася ўзгадаць факт зь біяграфіі чалавека, якога цяпер запіхваюць у вітрыну БССРу і які праз усё жыцьцё сумленна працаваў на тое, каб Беларусь была менш беларускай, а больш савецкай і сацыялістычнай (бССр).

Да 1968 году бССр прыкладна адлавядала гэтай мэце жыцьця, але ў Чэхаславаччыне пачалі думаць пра «чалавечае аблічча сацыялізму». Мазураў, як член Палітбюро ЦК КПСС, браў удзел ва ўсіх спробах пераканаць чэхаў і славакаў «адумацца». Адзін зь дзеячоў Праскай вясны Ф.Крыгель пісаў: «Я пабачыў неверагодна нізкі ўзровень гэтых людзей, якія не прачыталі ў жыцьці ніводнай кнігі Маркса альбо Леніна... Калі я думаю, што лёсы сьвету залежаць ад іх, я не магу спаць...» Тагачасны дырэктар Чэхаславацкага тэлебачаньня Й.Пэлікан пасьля шматлікіх візытаў у СССР адзначаў: «Узровень некаторых савецкіх лідараў быў настолькі нізкі, што я заўсёды казаў сам сабе — як увогуле яны кіруюць Савецкім Саюзам?..»



У той час наш зямляк быў зроблены прадстаўніком Палітбюро ЦК КПСС у Чэхаславаччыне, каб рыхтаваць уварваньне савецкай арміі. Седзячы ў савецкай амбасадзе ў Празе, Мазураў паводле рэкамэндацыяў Брэжнева спрабаваў сфармаваць марыянэткавы чэхаславацкі ўрад, «дасылаючы ў Маскву істэрычныя тэлеграмы пра тое, што сытуацыя знаходзіцца на мяжы выбуху». Быў сфальсыфікаваны ліст аб запрашэньні братніх войскаў на дапамогу заваёвам сацыялізму.

21 жніўня ўраньні паўмільённая савецкая армада разам з 300-тысячным войскам сатэлітаў уварвалася ў Чэхаславакію. На 21 год чэхі і славакі зноў трапілі ў жалезныя абдымкі Масквы.

Дзяржаўная камісія Чэхаславакіі высьветліла, што ў пэрыяд з 21 жніўня па 17 сьнежня 1968 г. у выніку замежнай інтэрвэнцыі загінула чэхаславацкіх грамадзянаў 94 чалавекі. 53 зь іх забітыя з агнястрэльнай зброі, 38 — раздушаныя вайсковай тэхнікай, трох — зь іншай прычыны. Найбольш ахвяраў — у Празе (16 — каля будынку Чэхаславацкага радыё). 345 чалавек было цяжка паранена. Непасрэдную адказнасьць за гэта нёс і наш славуты зямляк, які ў некаторых успамінах раптам зрабіўся дысыдэнтам і ворагам Брэжнева.

Віталь ЗАЙКА

**На здымку: В.Кебіч адкрывае мэмарыяльную шыльду на доме па вуліцы К.Маркса ў Менску, дзе жыў К.Мазураў**

## Ліст з суда

Суд вырашыў: «Прызнаць зьневажальнымі для гонару і годнасьці Данілава Генадзя Ільіча і не адлаведнымі сапраўднасьці фотавыяву з суправаджальным подпісам «Генадзь Данілаў (начальнік саўмінаўскай Управы грамадзкай бясьпекі і абароны) выступае ў судзе Цэнтральнага раёну Менска ў «абарону свайго гонару і годнасьці», зьмешчаную ў газэце СВАБОДА №1—2 за люты 1993 году. Прызнаць не адлаведнымі сапраўднасьці і зьневажальнымі для гонару і годнасьці Данілава Генадзя Ільіча наступныя зьвесткі, апублікаваныя ў той жа газэце №1—2 за люты 1993 году ў артыкуле «Кватэра для жонкі. Чужой»: «Можа, рэч у тым, што да нядаўняга часу пад яго кіраўніцтвам працаваў начальнікам аддзелу па барацьбе з эканамічнай злачыннасьцю Мікалай Данілаў, сваяк вядомага начальніка ўправы СМ РБ Генадзя Данілава. А Саўмін, як вядома, сваю крэатуру проста не аддае».

Абавязаць вытворча-выдавецкую фірму «Газэта СВАБОДА» надрукаваць абвяржэньне гэтых зьвестак на працягу месяца з дня ўступленьня рашэньня ў законную сілу.

Член Менскага гарадзкога суда
А.САКАЛОЎСКАЯ





© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Як змагацца супраць шпіёнаў і тэрарыстаў

З разьвіцьцём беларускае дзяржаўнасьці й рынкавых дачыненьняў паўстае праблема захаваньня дзяржаўных і камэрцыйных таямніцаў, а таксама аховы важных дзяржаўных службоўцаў і кіраўнікоў фірмаў ад замахаў, выкраданьняў, падслухоўваньня і г.д. На жаль, шмат хто захоўвае ілюзію, быццам спэцслужбы й злачынныя банды ёсьць паважнаю пагрозаю ў іншых дзяржавах, але толькі ня ў нас. Мы застаемся легкадумнымі й бясклапотнымі, хоць не бракуе сьведчаньняў таго, што замежныя выведкі пашыраюць дзейнасьць у Беларусі, а арганізаваныя злачынныя групоўкі ўсё часьцей карыстаюць з вытанчаных шпіёнскіх мэтадаў. Цікава пазнаёміцца з багатым заходнім досьведам у гэтай галіне.

Як жа засьцерагчыся? Неабходна ствараць сыстэму аховы, прычым гэта мусіць быць не кароткатэрміновай акцыяй, а доўгім працэсам. Давядзецца адкінуць думку, што можна дасягнуць 100-працэнтавай бясьпекі. Распачаць трэба зь мейсца працы, дзе перадусім унармаваць доступ да таемнай інфармацыі. Ніводны цікаўны чалавек не павінен самастойна перасоўвацца па частцы офіса або фірмы, дзе разьмешчаныя кабінэты кіраўніцтва, таемная канцылярыя, пакоі для перамоваў і г.д. У буйных фірмах належыць увесьці асабовыя карткі са здымкам і знакам, што дазваляе знаходзіцца ў пэўных памяшканьнях, а таксама пропускі-ідэнтыфікатары для гасьцей. Неабходна ўкараніць мэханізм праверкі асобы і паўнамоцтваў іншаземцаў, якія зьвяртаюцца ва ўстановы з рознага тыпу прапановамі. Нявaрта задавольвацца рэкамэндацыямі накшталт: «Я ад спадара Y зь міністэрства X».

Што рабіць з дакумантамі? Трэба карыстацца прынцыпам так званага «чыстага стала», зь якога адразу ж павінны прыбірацца ўсе ўжо скарыстаныя дакуманты. Важныя надпісы нельга рабіць ад рукі на блёках паперы. Пасьля зьняцьця сьпісанай старонкі на астатніх аркушох блёку можна прачытаць зьмест запісаў аж да трэцяй старонкі ўглыбіню. Таксама можна счытаць інфармацыю са стужкі мэханічнай друкавальнай машынкі, калі яна не прайшла праз шрыфт (туды і назад) сама менш 5-7 разоў.

Вялікая праблема ўзьнікае з офісным абсталяваньнем, што ўтварае моцнае індукцыйнае поле. Друкавальная машынка, кампутар, ксэракс або факс, што спрамяняюць такое поле, могуць стаць (нават без усталяваньня ў іх «жучкоў») перадавальнікамі ўсяго, што на іх пішацца, капіруецца або перасылаецца. Посьпех залежыць толькі ад адчувальнасьці прыймальных прыладаў. Лініямі перадачы імпульсаў могуць быць тэлефонная і электрычная сетка, цэнтральнае ацяпленьне й каналізацыя, апорныя элемэнты будынку і г.д. Трэба толькі закласьці адпаведны прыймальнік.

Ідэальным памяшканьнем для падобных машынаў быў бы пакой без тэлефона, сьвятла і цэнтральнага ацяпленьня, але паколькі гэта немажліва, дык рызыку трэба зьвесьці да мінімуму, напрыклад, «абясшкодзіць» радыятар, аддзяліўшы яго ад мэталёвых трубаў кавалкам плястыкавай трубкі. Друкавальную машынку ставіць за 3-4 мэтры ад электраправодкі і каналізацыйных трубаў. Чым старэйшая гэтая машына, тым лепей. Найноўшыя маюць нагэтулькі магутныя электрамагніты, што іх можна «падслухоўваць» нават за некалькі сотняў мэтраў!

Кампутары, прынтары й маніторы павінны стаяць у памяшканьнях з абмежаванай магнэтычнай прапушчальнасьцю. Трэба выкарыстоўваць «клетку Фарадэя», памяшканьні выкладваць спэцыяльнаю фольгаю, а на карпусы прыладаў напыляць рэчывы, што гасяць спрамяненьне. Інфармацыю перасылаць па валаконнааптычных лініях. У кампутарах з сакрэтнай інфармацыяй прадугледзець магчымасьць аддзяленьня і асобнага захаваньня цьвёрдых дыскаў; да таго ж трэба пазьбягаць перадачы нешыфраваных зьвестак у кампутар, куды сьцякаецца сакрэтная інфармацыя, праз тэлефон (мадэм).

Мэбля ў офісе павінна быць адсунутая ад сьценаў на 3—5 см. Гэта дазволіць спраўджваць, ці ня ўпала што-небудзь за шафу, і ўскладніць усталяваньне «жучкоў». Сакрэтныя нататкі й дакуманты належыць расьцінаць на палоскі шырынёю ня болей за 3 мм або спальваць. Ні ў якім разе нельга перадаваць таемную інфармацыю праз тэлефон. З сучаснаю падслухоўнаю тэхнікай і дасканалым веданьнем нашых тэлекамунікацыйных сыстэмаў калегамі па былым СССР перадаваньне такіх зьвестак бязь іх папярэдняга шыфраваньня папросту недапушчальнае.

Палітыкі, высокія ўрадоўцы, бізнэсмэны, людзі розных вольных прафэсіяў часьцей, чым іншыя грамадзяне, могуць выклікаць зацікаўленасьць, а, магчыма, і рабіцца ахвярамі фізычнага нападу з боку замежных спэцслужбаў, злачынных груповак, тэрарыстаў або псыхічна хворых асобаў. Як належыць сябе паводзіць у такіх выпадках? У Беларусі тэма гэтая — суцэльная «белая пляма», бо да нядаўняга часу мы былі параўнальна бясьпечнаю краінаю, што ляжала на ўзбочыне тэрарыстычных шляхоў, дзе практычна не было злачынных бандаў, у якой амаль ніколі не выкрадалі людзей з мэтай атрымаць палітычныя саступкі або выкуп, не нападалі на банкі, пошты, валютныя канторы, дамы, машыны на дарогах і г.д. Але апошнімі гадамі колькасьць такіх злачынстваў увесь час расьце, і памянёныя людзі, што належаць да свайго роду «групы рызыкі», таксама павінны ведаць, як вызначыць небясьпечныя для жыцьця сытуацыі і як сябе ў іх паводзіць.

Кожная замежная спэцслужба, злачынная група або тэрарыстычная арганізацыя перад пачаткам фізычных дзеяньняў супраць пэўнай асобы выведвае пра яе прыватнае жыцьцё. Тыя, хто можа стацца ахвярай нападу, павінны рэзка зьмяніць стаўленьне да навакольнага сьвету. Ідэалісты і асобы, што не заўважаюць вакол сябе пагрозаў, павінны ўсьведаміць, што такім чынам, прытым маючы высокую пасаду, папулярнасьць або дэманструючы багацьце, можна справакаваць напад.

Пачаць трэба з клопату пра ананімнасьць. Варта перастаць раздаваць направа і налева візытоўкі з прыватным адрасам і тэлефонам, выразна аддзяліць прыватнае жыцьцё ад прафэсійнага і не абмяркоўваць працоўных справаў па-за мейсцам працы. Неабходна адмовіцца ад рутынавага раскладу дня. Трэба старацца мець сталы кантакт з блізкімі. Самаізаляцыя ад магчымасьці выклікаць дапамогу — гэта, фактычна, запрашэньне да нападу. Таму, напрыклад, не рэкамэндуецца адному сыходзіць зь вялікіх прыёмаў.

Важна сачыць за бясьпекаю ўласнага дому. Трэба прывучыць усю сям'ю, асабліва дзяцей, нікому не казаць пра расклад дня й звычкі асобы, якой патрабуецца ахова. Трэба захоўваць у таямніцы пляны адпачынку.

Падчас выправаў у горад, на шпацыр або на працу трэба ўнікаць сталых трасаў. Трэба зважаць на машыны, кіроўца або пасажыр якіх просяць інфармацыю: вас могуць уцягнуць усярэдзіну. Варта хадзіць па сярэдзіне ходніка, а ўвечары абмінаць паркі ды сквэры.

Досьвед замежных краінаў сьведчыць, што болей за 3/4 усіх забойстваў важных асобаў, тэрарыстычных нападаў, выкраданьняў мае мейсца да, падчас або адразу ж пасьля язды. Таму рэкамэндуецца езьдзіць на працу й дадому рознымі трасамі і быць нутрана падрыхтаваным, што аўтамабіль трэба будзе нават пашкодзіць, каб унікнуць пагоні або замаху. Няможна падвозіць незнаёмых, вокны ў машыне трэба мець замкнёныя або прачыненыя сама больш на 3-5 см. У небясьпечных раёнах горада варта блякаваць дзьверы. Падчас язды выбіраць сярэдні шэраг, каб мець магчымасьць розных манэўраў. Калі вы пераканаецеся, што нехта вас перасьледуе, заблякуйце дзьверы й вокны, уключыце сьвятло й сыгнал і, не дазваляючы заехаць сябе, накіроўвайцеся ў кірунку сядзібы паліцыі або войска.

Апісаныя тут асноўныя рэкамэндацыі, вядома, ня ўлічваюць усіх небясьпечных сытуацыяў, у якія можа трапіць высокапастаўленая асоба. Гэта толькі некаторыя прапановы, што вынікаюць з досьведу, сабранага ў іншых краінах, досьведу, які ўжо назапашваецца і ў Беларусі.

**Паводле замежнай прэсы**
**падрыхтаваў**
**Вінцук ШОСТКА**



Група ФБР дзеля барацьбы з тэрарызмам заўсёды гатовая да дзеяньняў

# Аптымізм на вулькане

**У адным зь нядаўных нумароў уплывовай польскай газэты *Polityka* было надрукаванае інтэрвію зь вядомым францускім навукоўцам, дырэктарам парыскага Інстытуту міжнародных і стратэгічных дачыненьняў Паскалем Баніфасам. Тэмай размовы быў набалелы канфлікт на тэрыторыі былой Югаславіі.**

Сп. Баніфас аптымістычна глядзіць на магчымасьці разьвязаньня балканскае крызы, бо ў Сараеве перамагла дыпляматычная лёгіка, і ўпершыню за ўсю гісторыю канфлікта зблізіліся пазыцыі расейцаў, амэрыканцаў ды эўрапейцаў. Ён мяркуе, што цяпер пазыцыі амэрыканцаў ды эўрапейцаў ідэнтычныя, а расейцы таксама пачынаюць схіляцца ў той самы бок. Усе, аднак, добра ведаюць, што Злучаным Штатам бліжэйшыя мусульмане, што немцам бліжэйшыя харваты, расейцам — сэрбы, а Францыя, якая напачатку болей падтрымлівала сэрбаў, стараецца цяпер знайсьці кампраміс з усімі бакамі. Немцы павінны націскаць на харватаў, каб тыя згадзіліся даць басьнійцам доступ да мора, бо бяз гэтага міру ня будзе. Расейцы павінны растлумачыць сэрбам, што трэба згадзіцца на тэрытарыяльны кампраміс, бо яны захапілі нашмат болей, чым ім належыць.

Найбольшы націск павінны выявіць амэрыканцы ў дачыненьні да басьнійцаў, бо пасьля рэарганізацыі войска і атрыманьня (нягледзячы на эмбарга) вялікіх партыяў зброі яны ўсё яшчэ вераць у вайсковае разьвязаньне і магчымасьць вяртаньня страчаных тэрыторыяў.

Згадваючы пра ролю Расеі ў канфлікце, Паскаль Баніфас зазначыў, што з часу канфлікту ў Пэрсыдзкай затоцы Расею адхілілі ад прыняцьця рашэньняў на сусьветнай арэне. Але, выявілася, ненадоўга. Першай прыкметай вяртаньня Расеі на міжнародную дыпляматычную арэну было вэта супраць рэзалюцыі Рады Бясьпекі ў справе прысутнасьці сілаў ААН на Кіпры. Адбылося тое ўвесну летась, і ўся гэтая справа Расеі ня надта рупіла. Масква папросту хацела даць выразны сыгнал: маўляў, мы маем яшчэ што сказаць у сьвеце. Але каб сьвет заўважыў гэты сыгнал, патрэбны быў штурм на парлямант і зьмена фронту, калі Расея выступіла супраць уваходу Польшчы ў НАТО.

Напрыканцы інтэрвію сп. Баніфас папярэджвае, што Захаду трэба быць пільным, каб з адной крайнасьці ня трапіць у другую. Пасьля памылкі, якой было поўнае незважаньне на Расею, няможна ёй даваць своеасаблівага права вэта на заходнюю палітыку.

**Падрыхтаваў**
**Віктар ЛУК'ЯНАЎ**

# Ці паразумеемся зь летувісамі на іўрыце?

**Зусім нядаўна студэнты Менскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўнівэрсытэту атрымалі магчымасьць вывучаць яшчэ адну даволі экзатычную мову — іўрыт. На жаданьне студэнтаў будуць створаныя групы навучаньню іўрыту як другой спэцыяльнасьці. Выпускнікоў унівэрсытэту з такой спэцыяльнасьцю мяркуюць накіроўваць настаўнікамі ў новыя габрэйскія школы Беларусі.**

Варта прыгадаць, што студэнты МДЛУ ўжо маюць мажлівасьць засвоіць, апрача найбуйнейшых эўрапейскіх моваў, і такія, як, напрыклад, японская, кітайская, арабская, швэдзкая і г.д.

Шкада толькі, што кіраўніцтва ўнівэрсытэту не зьвяртае ўвагі на так званыя «мовы народаў СССР», нават нашых найбліжэйшых паўночных суседзяў летувісаў і латышоў. Няўжо мы зьбіраемся вечна зь імі стасавацца на «языке межнационального общения»? Або ўсе надзеі ўскладаюцца на іўрыт?

**В.Г.**



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## Вядомы бізнэсмэн трапіў на лаву падсудных

**У судзе Фрунзэнскага раёну Менска працягваецца працэс над вядомым у дзелавых і крымінальных колах Беларусі бізнэсмэнам Васілём Стасюком.**

Нягледзячы на тое, што разгляд справы ідзе за зачыненымі дзьвярыма, удалося дазнацца пра некаторыя падрабязнасьці. Сп. Стасюк абвінавачваецца адразу па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэксу. У прыватнасьці, яму інкрымінуецца арганізацыя замоўленага хуліганскага дзеяньня ў дачыненьні да дырэктара рэстарана «Беларусь», падробка мэдыцынскай даведкі для атрыманьня пасьведчаньня кіроўцы, махлярства (атрымаўшы ад нямецкіх партнэраў 100 тыс. дойчмарак у якасьці перадаплаты, Стасюк так і не паставіў ім абяцаны тавар), а таксама крадзёж 100 тысяч даляраў у аб'яднаньня «Якутлес».

Гэта далёка ня поўны пералік фактаў законанепаслушэнства сп. Стасюка. Паводле зьвестак СІМ, раней ён быў заўважаны ў гандлі крадзенымі аўтамабілямі, ухіленьні ад уплаты падаткаў і кантрабандзе. Аднак яму заўсёды ўдавалася выйсьці сухім з вады. Крымінальныя экспэрты СІМ лічаць, што пазьбегнуць адказнасьці сп. Стасюку, на якога тройчы быў абвешчаны ўсесаюзны росшук за розныя правапарушэньні, дапамагалі сувязі ў беларускім урадзе і Менскім гарадзкім ДАІ.

## Сьляды забойцы Лісьнічука вядуць у Эстонію

**Сьледзтва па справе забойства старшыні рады Белбізнэсбанку і кіраўніка канцэрну «Комінвест» Аляксандра Лісьнічука, які загінуў 11 траўня летась, здаецца, зрушылася зь мёртвага пункту.**

Як стала вядома з кампэтэнтных крыніцаў, беларускім дэтэктывам удалося выявіць шлях, якім трапіў у Менск карабін, зь якога быў забіты сп. Лісьнічук. Гэтая зброя была вырабленая на індывідуальную замову ў Нямеччыне, затым вывезеная ў Фінляндыю, а адтуль трапіла ў эстонскую службу аховы краю. Гэтая акалічнасьць дае падставы сьледзтву меркаваць, што выканаў замову, хутчэй за ўсё, наёмны забойца з Прыбалтыкі.

*СІМ*

**Гарадзенскія сюжэты**

# Пакуль вуніяты спадзяюцца на Шаладонава, манашкі сеюць на газонах бульбу

**На першай траўцы маляўніча рассыпаліся апэльсыны, сярод іх стаялі кардонікі з цытрусавым сокам. А побач праваслаўныя манашкі саджалі на газонах бульбу і флянсы памідораў. Навокал хадзілі музэйныя супрацоўнікі і адно дзівіліся: навошта манашкам тыя мех-два бульбы з газону, калі ім жывецца зусім някепска, бо апроч цытрусавых харчуюцца ўсякімі кансэрваванымі прысмакамі з заходняй гуманітарнай дапамогі?.. Адбывалася гэта з намі на падворку Дзяржаўнага музэя рэлігіі, які дажывае веку ў базылянскіх мурох, куды ўжо ўсяліўся праваслаўны жаночы манастыр.**

СВАБОДА два гады таму пісала, як праваслаўныя бралі штурмам камяніцу музэйнікаў, выкідалі на вуліцу мэблю. Рабілася гэта са згоды абласных уладаў, міліцыі было забаронена заступацца за музэй... Ад таго часу шмат вады сплыло. Пазыцыі праваслаўя, праўда, крыху пахіснуліся: ня стала Дз.Арцымені, высланы з Горадні япіскап Валянцін. Тымчасам сканчаецца рамонт у недалёкім палацы Храптовіча, куды перанясуць музэй. Здавалася б, канфлікт вычарпаны. Аднак на базылянскі кляштар дагэтуль прэтэндуе грэка-каталіцкая грамада, хоць і бяз посьпеху. Такім чынам, праблема ня вырашаная, а загнаная пад спод.

Утварылася суполка гарадзенскіх вуніятаў 14 красавіка 1991 г., а зарэгістравалі яе абласныя ўлады толькі 12 кастрычніка 1992 г. Гэтага часу якраз хапіла, каб 19 лютага 1992 г. Сьвяшчэнны сынод Рускай праваслаўнай царквы палічыў патрэбным аднаўленьне «на территории Гродненской области самостоятельной епископской кафедры» і вырашыў хадайнічаць перад мясцовай уладай «о возвращении бывшего архиерейского дома». Тут жа ў адказ прымаецца рашэньне аблвыканкаму аб перадачы эпархіі дома, але зусім не архірэйскага і зусім у іншым мейсцы горада, а менавіта — камяніцы адміністрацыі музэя на тэрыторыі базылянскага кляштару. Потым быў штурм, пасыўнасьць міліцыі і г.д. Пазьней — передача праваслаўнаму манастыру храма і кляштару ўвогуле — у дзень «слаўных» 150-х угодкаў перадачы царом базылянскіх муроў сваім русыфікатарам у расах. Пра гэта СВАБОДА сваім часам таксама паведамляла.

За ўсімі гэтымі вонкавымі падзеямі засталіся нябачнымі спробы вуніятаў абскардзіць адыёзнае рашэньне аблвыканкаму судовым чынам. Усё марна! Абласны народны суд пераслаў справу ў Ленінскі раённы, той таксама адмовіўся прымаць яе да разгляду. Маўляў, паколькі тут спрэчка паміж дзьвюма юрыдычнымі асобамі, дык няхай разглядае гаспадарчы. Але і абласны гаспадарчы суд адмовіўся прымаць заяву ад вуніятаў. Зьвярнуліся тады ў Найвышэйшы гаспадарчы, дзе добрыя дзядзькі параілі: зьвяртайцеся ў свой абласны гаспадарчы суд (!). А нядаўна прыйшла адмова ўжо з абласной пракуратуры: «Падставаў для апратэставаньня ня знойдзена». Пісалі і Шушкевічу, і Кебічу.

Усе іхныя лісты перасылаліся зь Менску ў аблвыканкам да сп. Кантаровіча, які кіруе Саветам па справах рэлігіяў. А ён, яшчэ пры нябожчыку Арцымені засьведчыўшы сваю прыхільнасьць да праваслаўя, нязьменна адказвае: «основания для пересмотра решения нет», ніяк не зважаючы на просьбы даць хоць бы такі ж самы адказ, але на беларускай мове. Сп. Кантаровіч адно ласкава параіў вуніятам праводзіць набажэнствы на мейсцы рэгістрацыі суполкі, г.зн. у аднапакаёвай кватэры па вул. Леніна. Вуніяты цяпер складаюць паперу да ген. пракурора сп. Шаладонава. Калі і ён адмовіць, дык застанецца, як цяпер змрочна жартуюць, хіба пісаць да Бутраса Бутраса Галі.

Вось так! Нават да разгляду не прымаюць скаргу. Хоць у законе аб свабодзе веравызнаньняў і рэлігійных арганізацыях запісана вельмі выразна: «Спрэчкі па пытаньнях, якія датычаць валоданьня і карыстаньня культавымі будынкамі і маёмасьцю, вырашаюцца ў судовым парадку, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам РБ». Улады думаюць, што, адфутбольваючы вуніятаў, вырашаюць праблему. «Блажен, кто верует»!

Пакуль што грэка-каталікі адпраўляюць набажэнствы штонядзелі ў... гарадзкім Доме культуры. Ужо зарэгістраваныя 5 шлюбаў паводле вуніяцкага абраду, хрысьцяць дзяцей, хаваюць нябожчыкаў. Апроч айца Віктара, нядаўна высьвячаны таксама дыякан. Пяцёра хлопцаў (адзін у Польшчы, астатнія — на Ўкраіне) вучацца на сьвятароў. Калі яны вернуцца назад у Горадню, ігнараваць грэка-каталікоў стане цяжэй.

Гаворачы, што прэтэндуюць на сваё, яны спасылаюцца на дакументы архіву Гарадзенскага вуніяцкага жаночага кляштару Раства Багародзіцы, якія захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Ўкраіны ў Львове. Там сказана, што паколькі гарадзкі пажар зьнішчыў драўляныя пабудовы кляштару і сам храм, мітрапаліт Леў Кішка каля 1720 г. аднавіў яго ў цэгле на ахвяраваньні вернікаў-вуніятаў.

Сёньня грэка-каталікі гавораць, што іхная вера вельмі добрая для распаўсюджаных у нас рэлігійна зьмяшаных сем'яў: абрад праваслаўны, але адбываецца ў касьцёле. Нездарма ж, мабыць, зусім нядаўна створана грэка-каталіцкая дзясятка ў Лідзе, робяцца захады і ў іншых мясьцінах вобласьці.

**В.ВАСІЛЕВІЧ**

## Ня лезуць даляры ў горла

**У Кузьніцы на мяжы зь Беларусяй польскія мытнікі затрымалі грамадзянку Рэспублікі Беларусі, якая спрабавала вывезьці незадакляраваныя 1500 даляраў сотневымі купюрамі.**

Каб грошы не дасталіся палякам, кабета запіхала іх у рот і спрабавала праглынуць, але ня здолела.

**Міхал ВАЎКАВЫЦКІ**

## Праграма 8-га каналу з 20 па 24 красавіка

**Серада, 20 красавіка**

18.00 Рэкляма.
18.05 Для дзяцей: «Карусэль», мультфільм «Я ня веру ў забабоны».
18.30 Муз. праграма.
19.00 Спартовая праграма. 1-ы зімовы Чэмпіянат Беларусі ў бегу на 100 км у зачыненым памяшканьні.
19.25 «Хіл-стрыт Блюз».
20.15 «Прыгоды капітана Ўрунгеля». 5-7 сэрыі.
20.45 «Швайцарскія Рабінзоны». 17 сэрыя.
21.35 Справы надзённыя.
21.45 «Настаўнік танцаў». Маст. фільм.
23.25 Рэкляма.

**Чацьвер, 21 красавіка**

18.00 Рэкляма.
18.05 Мультсэрыял «Сям'я Барклі». Мультфільм «Свавольствы на фэрме».
18.35 Муз. праграма.
19.05 «Лябірынт правасудзьдзя».
19.55 «Файт». Кікбоксінг.
20.15 «Прыгоды капітана Ўрунгеля». 8—10 сэрыі.
20.45 Сямейнае кола.
20.55 «Лёс». 54 сэрыя.
21.35 Роздумы пра джаз.
22.25 «Філятыма». Маст. фільм з сэрыі «Я шпіён».
23.25 Рэкляма.

**Пятніца, 22 красавіка**

18.00 Рэкляма.
18.05 Для дзяцей: «Карусэль», мультфільм «Мумія».
18.30 «Солтэк» прэзэнтуе: «Дорэміфасолькі».
18.35 Муз. праграма.
19.05 Журфак БДУ прэзэнтуе...
19.15 «Хіл-стрыт Блюз».
20.00 «Прыгоды капітана Ўрунгеля». 11—13 сэрыі.
20.30 «Швайцарскія Рабінзоны». 18 сэрыя.
21.20 Час мясцовы.
21.40 Справы надзённыя.
21.50 «Граф Дракула». Маст. фільм.
23.25 Рэкляма.

**Субота, 23 красавіка**

15.00 Рэкляма.
15.05 Праграма пра здароўе «Жыцьцёвы выбар».
15.30 Прапаведнік Кенэт Копленд.
16.00 Відэасалён запрашае: «Праз церні да зорак». Маст. фільм.
18.25 «Спадарыня Ўдача».
18.50 Мультфільм «Малыш і Карлсан».
19.10 «Постаць». МКТ.
19.30 Муз. праграма. «Глядзіце, хто йдзе».
20.10 Сямейнае кола.
20.20 «Лёс». 55 сэрыя.
21.00 «Солтэк» прэзэнтуе: «Спартовая мазаіка».
21.30 Сем хвілінаў з «Хрыстафорам».
21.40 «Чацьвёра адчайных з Шао Ліня». Маст. фільм.
23.10 Муз. праграма.
23.25 Рэкляма.

**Нядзеля, 24 красавіка**

15.00 Рэкляма.
15.05 Дзіцячы экран. «Дзяцінства Бэмбі». Маст. фільм.
16.20 Казань айца Міхала.
16.25 Нямецкая хваля.
16.55 «Затока Небясьпечная».
17.25 Мультфільм.
17.40 «Схаваная камэра». Камэдыйнае шоў.
18.00 «Солтэк» прэзэнтуе: «Тэлефэн», «Вуліца».
18.30 «Бізнэс-плян». ММ4.
18.50 «Карлсан вярнуўся». Мультфільм.
19.10 Кароткамэтражны фільм «Міжнародны рабунак».
19.35 Стрэс-паўза.
19.40 «Давайце патанцуем». Муз. праграма.
20.10 «Лёс». 56 сэрыя.
20.50 Тэлечасопіс «Відэамода».
21.15 «Джынджэр і Фрэд». Маст. фільм.
23.25 Рэкляма.

**За кадрам**



Менскі мэр Аляксандар Герасіменка *(на здымку)* дэманструе заклапочанасьць сёньняшнім і заўтрашнім днём беларускай сталіцы. Самая актуальная праблема — дзе ўзяць грошы, каб адрамантаваць менскія дарогі. Відаць, без спадара Чарнамырдзіна гэтую праблему вырашыць немагчыма.

Каб мець уяўленьне, як будзе разгортвацца сытуацыя далей, сачыце за інтэграцыйнымі працэсамі дзьвюх братніх славянскіх рэспублікаў. Прысутнасьць побач з мэрам дзяўчат у мусульманскіх строях дае падставу думаць, што інтэграцыя можа быць значна шырэйшая.



Падпісны індэкс 63887. Нумар падпісаны ў друк 19.04.94. Друкарня "Беларускі Дом Друку" (Менск, пр. Ф.Скарыны, 79). Замова 524 Наклад 26 000.
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010